Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчынв

| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
|---|---|
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| _______________Д. В. Герасіменак | _______________Ю. М. Галкоўская |
| ___29 июня___ 2023 г. | ___29 июня___ 2023 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*Прафілізацыя: Культурная спадчына і турызм)*

Складальнік:
Л.У. Ландзіна, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (пратакол № 10 ад 29.06.2023)

Складальнік:
*Л. У. Ландзіна*, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, доктар гістарычных навук, дацэнт

Рэцэнзенты:
Д. Г. Ларыёнаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі новага і найноўшага часу установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт”;
Кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт”

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны (пратакол ад 25. 05. 2023 г. № 11)

**ЗМЕСТ**

1. Уводзіны. С. 4–6
Тэматычны план С. 7–12

2. Тэарэтычны раздзел.
2.1 Вучэбныя выданні С. 13
2.2 План-каспект лекцый С. 14–49
2.3 Іншыя матэрыялы (навуковая літаратура, аудыя- і выдэарэсурсы) С. 50–52

3. Практычны раздзел. Матэрыялы для правядзення семінарскіх, практычных і інш. заняткаў С. 53–80

4. Раздзел кантроля ведаў:
4.1 Заданні для кантролю самастойнай работы студэнтаў С. 81–86
4.2 Пералік пытанняў для экзамену (заліку) С. 87–98
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў С. 99–101

5. Дапаможны раздзел:
5.1 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі СРС С. 102–107

# УВОДЗІНЫ

Гістарычныя дысцыпліны ўваходзяць у лік базавых для падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Вывучэнне гісторыі ў ВНУ накіравана на фарміраванне асобы, якая павінна свядома арыентавацца ў грамадскім жыцці, кваліфікавана аналізаваць мінулае і сучаснае, усведамляць прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, паважаць і захоўваць гісторыка-культурную спадчыну.

Вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі прызначана для дасягнення адзначаных мэт на першай ступені вышэйшай адукацыі. Курс айчыннай гісторыі мае вялікае адукацыйнае, навуковае і выхаваўчае значэнне, ен з'яўляецца тым асяродкам гістарычных ведаў, які найбольш блізкія студэнтам, выклікаюць ў іх адпаведнае стаўленне, знаходзяцца "на слыху" і ў памяці. Усе адзначанае, у сваю чаргу, дае вялікія адукацыйныя і выхаваўчыя магчымасці. Асаблівы эфект заключаецца таксама ва ўключанасці кожнага, праз уласную памяць ці памяць старэйшага пакалення, ў падзеі айчыннай гісторыі найноўшаша часу.

Вучэбна-метадычны комплекс скаладецца з тэматычнаг плана. Вучэбнай праграмы, матэрыялаў для правядзення семінарскіх заняткаў іі самастойнай работы студэнтаў, метадычных рэкамендацый для самастойнай работы, пытанняў для залікаў і экзаменаў і г.д.

*Метадалагічнай асновай* выкладання з'яўляецца спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага (культуралагічнага) падыходаў. Гэта дазваляе, з аднаго боку, прасачыць стадыяльнасць і змену этапаў грамадскага развіцця, а з другой – максімальна ўлічыць цывілізацыйныя асаблівасці беларускіх зямель. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызма і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці.

У праграме адлюстраваны таксама комплекс праблем, якія характэрызуюць сацыякультурнае развіццё грамадства. Адпаведна, вывучаецца развіццё навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацкай культуры. паўсядзеннага жыцця і г.д.

*Мэтай* курса гісторыі Беларусі з'яўляецца фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў-музеязнаўцаў і іх сацыялізацыі, што прадугледжвае таксама і ўменні набываць новыя веды і прымяняць іх ў прафесійным і штодзенным асяроддзі.

Адзначаная мэта прадугледжвае вырашэнне наступных *задач:*

- вызначэнне месца, ролі і зместа айчыннай гісторыі ў рамках сусветнай;
- абгрунтаванне перыядызацыі гісторыі Беларусі;
- усведамленне цэласнасці сусветна-гістарычнага працэсу і ўключанасці ў яго айчыннай гісторыі;
- сістэмнае бачанне гістарычнага працэса праз сінхранізацыю, правядзенне аналогій, параўнанне, вылучэнне сувязяў прычын і наступстваў;

- раскрыццё унутранай логікі гістарычных працэсаў і падзей, прасочванне іх дынамікі і ўзаемасувязі;
- выхаванне павагі да гісторыка-культурнай спадчыны, суаднясенне дасягненняў сусветнай і айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры;
- забеспячэнне пераемнасці і ўзаемасувязі матэрыяла выкладаемага курса са зместам сумежных дысцыплін праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння курса студэнт *павінен ведаць:*

- крытэрыі перыядызацыі, змест і структуру курса;
- асноўныя тэндэнцыі, працэсы і падзеі ў гісторыі Беларусі;
- сувязь прычын і наступстваў гістарычных падзей і працэсаў, суадносіны гістарычнай пераемнасці і нераўнамернасці;
- уплыў сацыяльных і культурных інстытутаў на практыку палітычнай дзейнасці.

Студэнт павінен *умець:*

- выкарыстоўваць асноўныя і дадатковыя крыніцы па выкладаемым курсе, вызначаць іх змест і сацыяльную накіраванасць;
- аналізаваць гістарычныя працэсы і падзеі, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;
- чытаць інфармацыю гістарычных карт, схем, дыяграм, а таксама ілюстрацыйнага матэрыялу;
- прымяняць у кантэксце айчыннай гісторыі веды па сумежных дысцыплінах (усеагульнай гісторыі, сусветнай мастацкай культуры, сусветнай літаратуры, рэлігіязнаўстве, культуралогіі, і г.д.).

Зместам вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый Зместам вучэбнай дысцыпліны "Усеагульная гісторыя. Раздзел 1. Старажытны свет" прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый

- ВК – 4 – Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;
- ВК – 7 – Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змяненняў, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных з'яў (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, дасканала выкарыстоўвацьвыяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці;
- БПК – 3 – Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры агульныя заканамернасці фарміравання культурнай спадчыны;
- БПК – 4 Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацыйвызначаць асаблівасці этнічных супольніцтваў, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыяльна-культурную сітуацыю.

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

*Вучэбныя выданні*

| Раздзелы і тэмы | Лекц. | Сем. | СРС | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| **Уводзіны** | | | | |
| Прадмет і мэты курса. Перыядызацыя. Асноўныя віды крыніц і накірункі гістарыяграфіі | 2 | | | |
| **Раздзел I. Беларускія землі ў старажытнасці і Сярэднявеччы** | | | | |
| Тэма 1. Першабытны лад на тэрыторыі Беларусі. Каменны век | 2 | 2 | | |
| Тэма 2. Беларускія землі ў бронзавым і жалезным веку. Балты і славяне | 2 | | | |
| Тэма 3. Канцэпцыі паходжання беларускага этнасу і назвы “Белая Русь” | | 2 | | |
| Тэма 4. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі. Полацкае княства | 1 | | | |
| Тэма 5. Палітычная гісторыя беларускіх зямель у высокім Сярэднявеччы. Феадальная раздробленасць | 1 | | | |
| Тэма 6. Тураўскае княства і яго развіццё ў X-XIII ст. | | | 1 | Рэфераты, прэзентацыі, адказы |
| Тэма 7. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX–XIII ст. | | 2 | | |
| Тэма 8. Развіццё культуры на землях Беларусі ў IX–XIII ст. | | | 1 | Міні-даклады, прэзентацыі, адказы на пытаніі |
| Тэма 9. Праблематыка і прычыны ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. ВКЛ у другой палове XIII – пачатку XIV ст. | 2 | | | |
| Тэма 10. Вялікае княства Літоўскае пры Гедыміне і яго пераемніках | 2 | | | |
| Тэма 11. Крэўская унія. ВКЛ пры Вітаўце | 2 | 2 | | |
| Тэма 12. Вялікае княства Літоўскае ў сярэдзіне XV – пачатку XVI ст. | 2 | | і | |
| Тэма 13. “Залаты век” Вялікага княства Літоўскага (першая палова XVI ст.) | 2 | | | |
| Тэма 14. Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XIII–першай палове XVI ст. | | 2 | | |
| Тэма 15 Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у XIV–XVI ст. Эвалюцыя аграрных адносін і запрыгоньванне сялян | | 2 | 1 | Міні-даклады, рэфераты,ад |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | казы на пытанні |
| Тэма 16. Развіццё заканадаўства і права і судовай сістэмы на беларускіх землях (ад звычаёвага права да Статутаў ВКЛ) | | 2 | | |
| Тэма 17. Культура Вялікага княства Літоўскага ў XIV – першай палове XVI ст. | | | 1 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| **Усяго за І семестр** | 18 | 14 | 4 | |
| **Раздзел ІІ. Вялікае княства Літоўскае ў ранні Новы час (XVI–XVIII ст.)** | | | | |
| Тэма 18. Вялікае княства Літоўскае ў еўрапейскай сацыяльна-эканамічнай і геапалітычнай прасторы XVI ст. | 2 | | | |
| Тэма 19. Перадумовы Люблінскай уніі. Лівонская вайна | 4 | | | |
| Тэма 20. Люблінскі сойм. Рэч Паспалітая ў другой палове XVI ст. | 2 | | | |
| Тэма 21. Сістэма ўлады і органы кіравання Рэчы Паспалітай. Становішча зямель ВКЛ | | 4 | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 22. Рэлігійнае развіцце Вялікага княства Літоўскага. Рэфармацыя ў ВКЛ і яе спецыфіка | 2 | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 23. Контррэфармацыя на землях ВКЛ. Дзейнасць каталіцкіх ордэнаў | 2 | | | |
| Тэма 24. Уніяцкая царква і яе роля ў развіцці беларускіх зямель | 2 | | | |
| Тэма 25. Палітычнае развіцце Рэчы Паспалітай у XVII ст. Войны і іх наступствы | 4 | | | |
| Тэма 26. Сацыяльныя канфлікты і барацьба ў Рэчы Паспалітай ў XVII – першай палове XVIII ст. | | 2 | | |
| Тэма 27. Рэч Паспалітая ў першай палове XVIII ст. Паўночная вайна і ўзрастанне замежнага ўплыву ў краіне | 2 | | | |
| Тэма 28. Гаспадарчае развіццё Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII ст. Фальваркавая сістэма | | 2 | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 29. Паглыбленне крызіса ў Рэчы Паспалітай і яе падзелы | 4 | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 30. Паўстанне Т. Касцюшка ў Польшчы і Літве | | 2 | | |
| Тэма 31. Асаблівасці культуры беларускіх зямель у XVII–XVIII ст. | | 4 | 4 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| **Усяго за II семестр** | 24 | 14 | 10 | |
| **Раздзел III. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (XIX – пачатак XX ст.)** | | | | |
| Тэма 32. Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Палітыка урада Расійскай імперыі на далучаных землях | 4 | | | |
| Тэма 33. Вайна 1812 г. і яе ўплыў на становішча беларускіх зямель | 4 | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 34. Шляхецкая рэвалюцыйнасць у канцы XVIII – першай палове XIX ст. | 2 | 2 | | |
| Тэма 35. Паўстанне 1830–1831 гг., яго вынікі і наступствы | | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 36. Развіццё эканомікі беларускіх зямель ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. | 4 | 2 | | |
| Тэма 37. Культура Беларусі першай паловы XIX ст. | | 2 | 2 | Рэфераты, прэзентацыі, адказы |
| Тэма 38. Адмена прыгоннага права і буржуазныя рэформы на тэрыторыі Беларусі | 2 | 2 | | |
| Тэма 39. Паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага | | 2 | | |
| Тэма 40. Развіццё эканомікі Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. | | 2 | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 41. Грамадска-палітычны рух у апошняй чвэрці XIX–пачатку XX ст. | 6 | | | |
| Тэма 42. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і яе падзеі на тэрыторыі Беларусі | 2 | | | |
| Тэма 43. Становішча у Расіі і Беларусі ў 1907–1914 гг. Сталыпінская аграрная рэформа | 2 | | | |
| Тэма 44. Беларусь у часы Першай сусветнай вайны | 2 | 2 | | |
| Тэма 45. Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі і на тэрыторыі Беларусі | 2 | | | |
| Тэма 46. Палітычнае становішча ў Расіі і Беларусі вясной-восенню 1917 г. | 2 | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 47. Культура другой паловы XIX-пачатку XX ст. Рух за нацыянальнае адраджэнне. “Наша Ніва” | | 2 | 2 | Рэфераты, прэзентацыі, адказы |
| Тэма 48. Асаблівасці этнічнага і канфесійнага складу насельніцтва Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. | | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| **Усяго за III семестр** | 32 | 16 | 12 | |
| **Раздзел IV. Беларусь у найноўшы час (XX – першая чвэрць XXI ст.)** | | | | |
| Тэма 49. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі | 2 | | | |
| Тэма 50. Германская акупацыя і Брэсцкі мір. Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе Рады | 2 | | | |
| Тэма 51. Утварэнне БССР і ЛітБел. Беларусь падчас грамадзянскай і савецка-польскай войн | 2 | | | |
| Тэма 52. Беларусь падчас грамадзянскай і савецка-польскай войн | 2 | | | |
| Тэма 53. НЭП у Беларусі. Беларусізацыя і развіццё культуры | 2 | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 54. Індустрыялізацыя і калектывізацыя ў БССР | 2 | | | |
| Тэма 55. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у 1930-я гг. | 2 | 2 | | |
| Тэма 56. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы | | 2 | | |
| Тэма 57. Беларусь напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны | 2 | | | |
| Тэма 58. Усталяванне акупацыйнага рэжыму. Калабарацыя | 2 | 2 | | |
| Тэма 59. Партызанскі і падпольны рух на тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне Беларусі | | 2 | | |
| Тэма 60. Пасляваеннае аднаўленне і развіццё Беларусі. Удзел БССР у стварэнні і дзейнасці ААН | 2 | | | |
| Тэма 61. БССР у перыяд эканамічных і сацыяльных рэформ 1953–1964 гг. | 2 | 2 | | |
| Тэма 62. БССР у 1965–1985 гг. | 2 | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 63. БССР у 1985–1991 гг. Распад СССР | 2 | | | |
| Тэма 64. Культура БССР у 1945–1991 гг. Беларусь на міжнароднай арэне | | | 2 | Міні-даклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 65. Станаўленне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Беларусь на сучасным этапе | 2 | | 2 | Міні-даклады, |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | рэфераты,адказы на пытанні |
| Тэма 66. Культура Беларусі ў постсавецкі час. Нацыянальнае адраджэнне | | | 2 | Мінідаклады, рэфераты,адказы на пытанні |
| **Усяго за IV семестр** | 28 | 10 | 10 | |

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

## Уводзіны

### *Прадмет і мэты курса. Перыядызацыя. Асноўныя віды крыніц і накірункі гістарыяграфіі*

Гісторыя Беларусі як частка усеагульнай гісторыі. Гістарычныя веды і іх значэнне ў нацыянальнай і грамадзянскай супольнасці. Айчынная гісторыя і яе месца ў нацыянальнай памяці і дзяржаўнай ідэалогіі.

Перыядызацыя гісторыі Беларусі і яе суадносіны з перыядызацыяй усеагульнай гісторыі. Падыходы да перыядызацыі гісторыі Беларусі. у расказ фармацыйнага падыхода існавалі перыядызацыя, згодна з якой вылучаліся перыяды першабытны, раннефеадальны (хаця гэта вельмі сумніўна з пункту гледжання аб'ектыўных працэсаў часоў складання феадальных адносінаў у Заходняй Еўропе і на ўсходнеславянскіх землях), перыяду капіталізма і сацыялізма. Існуе перыядызацыя паводле знаходжання беларускіх зямель у складзе пэўных дзяржаў. Адпаведна – старажытнарускі перыяд, перыял ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, СССР і г.д. Існуючы варыянт перыядызацыі айчыннай гісторыі грунтуецца на агульнапрынятай перыядызацыі.) Старажытнасць, Сярэднявечча, Новы час (і ранні Новы час), найноўшы час. Асноўны змест і важнейшыя этапы айчыннай гісторыі.

Асноўныя віды крыніц. Падыходы да вызначэння і класіфікацыі крыніц. Да сеняшняга дня вельмі спрэчная праблема. Сучасная гістарычная навука зыходзіць з таго, што крыніцай з'яўляецца любы артэфакт, які нясе інфармацыю аб мінулым. Гістарычная крыніца можа бясконца інтэрпрэтавацца ў залежнасці ад канкрэтных патрэб даследавання. На жаль, не захаваліся крыніцы ўласна ўсходнеславянскага паходжання, якія б адносіліся да ранняга сярэднявечча. Мы грунтуемся на крыніцах арабскіх, візантыйскіх, звестках з нарманскіх саг. "Аповесць мінулых часоў" датуецца XII стагоддзем. Першыя прыклады гістрыяграфічнага асэнсавання гісторыі Беларусі. Гістарыяграфічныя школы, іх храналагічныя межы і накірункі даследаванняў.

## Раздзел I. Беларускія землі ў старажытнасці і Сярэднявеччы

### *Тэма 1. Першабытны лад на тэрыторыі Беларусі. Каменны век*

Сутнасць першабытнага ладу, яго змест і віды перыядызацыі. Першабытнасць – гэта перыяд, падчас якога чалавецтва прайшло шлях антрапагенэза і вылучэння з гамінід чалавека разумнага; гэта перыяд шляху ад першабытнага статку да першых дзяржаў; ад жывельнага ўспрыняцця свету да маральных норм і рэлігіі; ад спажывецкай гаспадаркі да вытворчай.З'яўленне першых людзей на тэрыторыі Беларусі. Праблема вылучэння эпохі мусц'е. У нас няма дастатковых артэфактаў, каб дыягнасціраваць сярэдні палеаліт. Магчыма, у нам неандэртальцы былі, магчыма – не. Але яны маглі толькі мігрыраваць па нашай тэрыторыі. Першыя знаходкі груба апрацаваных прылад працы – Абідавічы і Свяцілавічы. Аднак гэта, як і першыя сітаянкі, адносіцца да верхняга палеаліту. Першыя стаянкі Бердыж і Юравічы.. Змяненне матэрыяльнай культуры ў эпоху мезаліту. Першае сталае

насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Радавая абшчына. Мацярынскі род і прычыны яго панавання. Неалітычная рэвалюцыя. Маркеры неалітычнай рэвалюцыі – ганчарства і выраб керамікі. Фундаментальнае значэнне керамікі як сродку захавання рэсурсаў. Змяненні ў матэрыяльнай культуры і сацыяльнай будове грамадства. Пераход да вытворчай гаспадаркі. Новае ў апрацоўцы камяню. Духоўная культура першабытнага грамадства і рэлігійныя ўяўленні першабытных людзей.

***Тэма 2. Беларускія землі ў бронзавым і жалезным веку. Балты і славяне***

Індаеўрапейцы і версіі іх паходжання. Да сеняшняга дня праблема спрэчная. Нават сама назва – індаеўрапейцы. Аб'яднанне еўропы і Індыі, якія знаходзяцца на супрацьлеглых канцах Еўразіі. Буйнейшыя групы індаеўрапейскіх пляменаў. Балты, славяне, германцы. Фіна-угры. З'яўленне індаеўрапейскіх пляменаў на тэрыторый Еўразіі.Культуры шнуравой керамікі. Жывелаводы, рухаліся на колавым транспарце, носьбіты патрыярхальнага ладу. Прыход індаеўрапейцаў на беларускія землі. Балты, іх групы і рассяленне па тэрыторыі Беларусі. Культура балтаў. Кантакты балтаў з іншымі народамі. Канетакты шчыльныя, гэта жалезны век, Рымская імперыя, актыўныя стасункі варварскіх народаў. Дарэчы, у нас знойдзеныя манеты рымскага часу. Для рымлян балты – гэта тыя ж варвары. Аднак балты не знаходзіліся непасрэдна ў межах рымскіх правінцый.

Гіпотэзы аб прарадзіме славян і падзел славян на паўднёвых, заходніх і ўсходніх. Прыход славян на беларускія землі. Міграцыйныя плыні славянізацыі. Поўдзень і паўднёвы усход. Звычайна археалагічныя культуры, размешчаныя на поўдні больш развітыя за паўночныя. Грамадскі лад і гаспадарчыя адносіны славян, іх матэрыяльная і духоўная культура. Пераддзяржаўны стан ваеннай дэмакратыі. Адносіны славян з Візантыяй. Вельмі часта славяне служылі ў візантыйскім войску. Славянізацыя балтаў і славянская каланізацыя тэрыторыі Беларусі. Асноўная археалагічныя культуры жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.

***Тэма 3. Канцэпцыі паходжання беларускага этнасу і назвы "Белая Русь***

Гістарычныя крыніцы аб прыходзе славян і рассяленні славянскіх пляменаў. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы як асноўныя плямены – насельнікі беларускіх зямель. Суседзі славян – фіна-угры. Гэта народы, якія засялялі вялізарныя прасторы паўночна-усходняй Еўразіі, у т.л. Урал і Сібір. Канцэпцыі паходжання беларускага этнасу: крывічска-дрыгавічска-радзімічская, руская, польская, фінская і г.д. Дадзеная акалічнасць тлумачыцца адсутнасцю самастойнай беларускай дзяржаўнасці ў перыяд складання нацыянальных гістарыяграфій. Адпаведна, дамінуючы погляд фармулявалі прадстаўнікі той дзяржавы, якая ўключала тэрыторыі Беларусі. У першую чаргу, Польшча і Расія. Канцэпцыя эвалюцыі і дыфузіі.

Версіі паходжання этноніма "русь". Чорная, Белая і Чырвоная Русь. Канцэпцыі паходжання тэрміна "Белая Русь".

### *Тэма 4. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі. Полацкае княства*

Шляхі фарміравання феадальных адносін у Еўропе. Сінтэзны і бессінтэзны варыянты феадалізацыі. Усходнеславянская супольнасць – арыял бессінтэзнага варыянта складання феадальных адносін.

Змяненні ў грамадскім ладзе усходніх славян і складанне дзяржаўнасці. Саюзы пляменаў і славініі. Лад ваеннай дэмаратыі. Пераддзяржаўны стан. Тры цэнтра усходніх славян – Ноўгарад, Полацк, Кіеў. Запрашэнне варагаў. Нарманская тэорыя і яе месца ў гістарыяграфіі.

Полацкае княства – першае дзяржаўнае ўтварэнне на тэрыторыі Беларусі. Адносіны Полацка і Кіева на розных этапах існавання Полацкага князтва. Дадзенае пытанне вельмі важнае, таму што існуе пункт гледжання, згодна з якім толькі адзін Кіеў дамінаваў у рэгіене, прычым гэта заўседы было так. Адпаведна, роля Полацка як самастойнага дзяржаўнага ўтварэння мінімізуецца. Першыя правіцелі Полацка. Рагвалод і версія аб тым, што ен "прыйшоў з-за мора". Зноў нарманскае паходжанне. Дарэчы, цікавы і такі момант, што Рагнеда не "захацела разуць рабыніча", а ў нарманскіх жанчын лічылася за лепшае застацца адной, чым звязаць свае жыццё з м ужчынай ніжэйшага статусу. Уладзімір Святаславіч і Рагнеда. Уваходжанне Полацка ў сферу уплыву Кіева.

### *Тэма 5. Палітычная гісторыя беларускіх зямель у высокім Сярэднявеччы. Феадальная раздробленасць*

Усталяванне незалежнага ад Кіева кіравання у полацку пры князі Ізяславе. Распаўсюджанне хрысціянства. Князь Брачыслаў Ізяславіч і набыцце новых тэрыторый Полацкам. Росквіт магутнасці Полацкага княства пры Усяславе Чарадзеі. Адносіны Усяслава з кіеўскімі князямі і Ноўгарадам. Будаўніцтва Полацкай Сафіі. Званы для Полацкай Сафіі – з Ноўгарада. Тым не меньш, будаўніцтва Полацкай Сафіі – вельмі моцная заяўка на лідэрства ва ўсходнеславянскім свеце.Нашчадкі Усяслава Чарадзея і іх адносіны з Кіевам. Глеб Менскі і Ўладзімір Манамах. Іх узаемную варожасць з негатўнмі эпітэтамі адлюстроўваюць летапісы.Высылка полацкіх князёў у Візантыю.

Палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя прычыны феадальнай раздробленасці. Удзельная сістэма. Драбленне Полацкага княства на ўдзелы. Землі Верхняга і Сярэдняга Падлняпроўя, Пабужжа і Пасожжа. Адносіны удзельных княстваў на беларускіх землях з суседзямі.

Славянская каланізацыя балцкіх зямель. Герцыке і Кукенойс. Стасункі славянскага і балцкага насельніцтва. З'яўленне крыжацкай пагрозы.

### *Тэма 6. Тураўскае княства і яго развіццё ў X–XIII ст.*

Асаблівасці геапалітычнага становішча тураўскіх зямель. Першае ўзгадванне аб Тураве. Месца Тураўскага княства ў сістэме спадчыннасці

ўлады на Русі. Буйнейшыя гарады Тураўскага княства. Спецыфіка грамадскага ладу Тураўскага княства.

Князь Святаполк і яго дзейнасць. Адносіны з Польшчай. Тураўскія землі ў сістэме ўладанняў Кіева. Князь Юрый Яраславіч і адасабленне Турава ад Кіева. Адносіны Тураўскага і Галіцка-валынскага княстваў.

Культура Тураўскага княства ў X–XIII ст.

***Тэма 7. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX–XIII ст.***

Шматукладнасць гаспадарчага развіцця беларускіх зямель. Элементы феадальнага, рабаўладальніцкага, першабытнаабшчынага ладу. Абшчынны лад. Верв. Сацыяльны лад і заняткі насельніцтва. Патрыярхальнае рабства.

Дыскусійны характар праблемы феадалізма. Розныя вызначэнні і трактоўкі феадалізма ў гістарыяграфіі. Сінтэзны і бессінтэзны шляхі феадалізацыі. Бессінтэзны варыянт феадалізацыі на беларускіх землях. Шляхі фарміравання і віды феадальнага землеўладання. Катэгорыі вольнага і залежнага насельніцтва. Шляхі пападання ў залежнасць ад землеўладальнікаў.

Сістэма ўлады і кіравання. Князь. Веча. Дружына. Апалчэнне. Прававые адносіны і судовая сістэма. “Руская праўда”.

***Тэма 8. Развіццё культуры на землях Беларусі ў IX–XIII ст.***

Прынясце і распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях. Заснаванне Полацкай і Тураўскай епархій. Двухвер’е.

Глаголіца і кірыліца. Дзейнасць Кірылы і Мяфодзія. З’яўленне помнікаў пісьменнасці на беларускіх землях. Берасцяныя граматы. Вельмі шмат іх у Ноўгарадзе, але знаходзяцца і ў нас. У першую чаргу – у Віцебску. Рукапісныя кнігі. Помнікі эпіграфікі і сфрагістыкі. Летапісанне. “Аповесць мінулых часоў”. Славянскі эпас. Быліны і іх персанажы.

Жыццё і дзейнасць беларускіх асвенікаў – Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Клімента Смаляціча, Аўраамія Смаленскага. Культурныя сувязі з Візантыяй і Заходняй Еўропай. Полацкая і гродзенская школы мураванага дойлідства. Буйнейшыя помнікі архітэктуры. Фрэскавы жывапіс. Дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва. Крыж Еўфрасінні Полацкай.

***Тэма 9. Праблематыка і прычыны ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. ВКЛ у другой палове XIII – пачатку XIV ст.***

Праблема прычын стварэння і характару Вялікага княства Літоўскага ў гістарыяграфіі. Пытанне прынцыпова важнае, таму што ў шэрагу впадкаў алмаўляеца самастойная роля беларускіх зямель у дадзеным працэсе. Асабліва калі спекулююць на слове “Літоўскае”. Канцэпцыі паходжання і этнічнага характару ВКЛ.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы стварэння Вялікага княства Літоўскага. Становішча славянскіх зямель на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XIII ст. Феадальная раздробленасць, славянская каланізацыя, адносіны з літоўскімі пляменамі. Грамадскі лад і гаспадарчыя заняткі лета-літоўскіх пляменаў. Стварэнне саюзаў пляменаў і іх перaддзяржаўны стан.

Рост крыжацкай экспансіі і рэакцыя на яе славянскага і балцкага насельніцтва. Заключэнне ваенных саюзаў. Заснаванне Рыгі. Лёс Герцыке і Кукенойса. Неўская бітва і лядовае пабоішча.

Узвышэнне Наваградка і запрашэнне Міндоўга на княжанне. Унутраная і знешняя палітыка Міндоўга. Стварэнне ядра Вялікага княства Літоўскага. Адносіны з Галіцка-валынскім княствам. Каранацыя Міндоўга. Забойства Міндоўга і палітычная барацьба пасля яго смерці. Войшалк і яго дзейнасць. Шварн Данілавіч і Трайдэн. Барацьба з крыжакамі і пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. Княжанне Віценя. Уваходжанне Полацка ў склад ВКЛ.

### *Тэма 10. Вялікае княства Літоўскае пры Гедыміне і яго пераемніках*

Версіі паходжання Гедыміна. Перанос сталіцы ВКЛ з Наваградска ў Вільню. Матрыманіяльная дыпламатыя Гедыміна. Сваіх даок Гедмін вдаў замуж за мазавнцкага князя, польскага каралевіча, Альгерд атрмаў к пасаг Віцебскае княства. Адносіны з Польшчай. Збіранне беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Практычна ўся сучасная тэрыторыя Беларусі, нават разам з Мінскам, увайшла ў склад ВКЛ."Не рушыць старыны, не ўводзіць навіны". Гэта традыцыйны тэзіс пры стварэнні феадальных дзяржаў. Галоўнае ў дадзеным працэсе – прызнанне васальных адносінаў, лаяльнасць, выплаты даніны. Усе мясцовыя звычаі, правы, традыцйныя прывілеі ўладу не цікавяць. Славянскі фундамент, шматканфесійны і шматэтнічны характера ВКЛ. Смерць Гедыміна і ўнутрыпалітычная барацьба ў ВКЛ.

Альгерд і Кейстут. Адхіленне Яўнуція ад пасаду і ўсталяванне сумеснага кіравання Альгерда і Кейстута. Падзел краіны. Барацьба Кейстута з крыжакамі. Наступленне Альгерда на ўсход. Бітва на Сініх водах. Далучэнне да ВКЛ украінскіх тэрыторый. Паходы Альгерда на Маскву. Саюз з Цвер'ю. Баланс адносін Масквы, Залатой Арды і Вялікага княства Літоўскага.

Унутрыпалітычная барацьба ў ВКЛ пасля смерці Альгерда. Андрэй Полацкі, яго правы на пасад і лёс. Канфлікт паміж Ягайлам і Кейстутам і Вітаўтам. Крыжакі і іх месца ў дынастычным канфлікце ў Вялікім княстве Літоўскім. Вайна Куйстута і Ягайлы. Забойства Кейстута і лёс Вітаўта. Палітычныя стасункі Вітаўта з крыжакамі і іх вынікі.

### *Тэма 11. Крэўская унія. ВКЛ пры Вітаўце*

Няўстойлівасць становішча Ягайлы. Смерць караля Людовіка Венгерскага і абвяшчэнне яго дачкі Ядвігі польскай каралевай. Праекты шлюбу Ядвігі. Вільгельм Аўстрыйскі і Земавіт Мазавецкі і іх дзеянні. Лёс Ядвігі. Шанаванне Ядвігі як святой ужо пры жыцці. Крэўская унія і яе ўмовы. Шлюб Ягайлы і Ядвігі. Няўдалы і без нашчадкаў. Прывілей 1387 г. Адносіны да уніі ў ВКЛ. Барацьба Вітаўта за незалежнасць ВКЛ. Больш таго, за вяртанне бацькоўскіх зямель. Вітаўт і крыжакі. Востраўскае пагадненне. Помста крыжакаў. Атручванне сыноў Вітаўта Івана і Юрыя. Двайная трагедыя – не толькі бацькоўская, але і дынастычная. Акрамя дачкі Соф'і ў Вітаўта нашчадкаў не засталося. Гарадзельскі прывілей.

Мерапрыемствы Вітаўта па цэнтралізацыі краіны. Уплыў на Вялікае княства Маскоўскае. Соф'я Вітаўтаўна. Вітаўт і Тахтамыш. Бітва на Ворскле і яе наступствы. Гібель практычна ўсіх удзельных князёў.Ператварэнне удзелаў у намесніцтвы. Вітаўт і Свяшчэнная Рымская імперыя. Падтрымка Вітаўтам гусітаў. Зразумела, каб "націснуць" на імператара ў справе надання крарлеўскай кароны. Адносіны Вітаўта і Ягайлы. Заклятыя сябры і стрыечныя браты. Сумесная барацьба супраць крыжакаў. Намаганні Вітаўта па атрыманню каралеўскай кароны.

### *Тэма 12. Вялікае княства Літоўскае ў сярэдзіне XV – пачатку XVI ст.*

Феадальная вайна пасля смерці Вітаўта. Свідрыгайла Альгердавіч і Жыгімонт Кейстутавіч як вельмі сімвалічныя фігуры, што адлюстроўваюць рускі і польскі ўплыў у Княстве. Пачатак кіравання Казіміра Ягелончыка. Роля Соф'і Гальшанскай у яго выхаванні і абвяшчэні вялікім князем. Прывілей 1447 г. Судзебнік Казіміра. Змяненні ў сістэме кіравання ВКЛ. Павышэнне ролі сойма і вялікакняжацкай Рады. Намаганні Казіміра Ягелончыка па нейтралізацыі экспансіянісцкіх памкненняў Польшчы і захаванню стабільнасці ў Вялікім княстве. Пераход да абароны у адносінах да Вялікага княства Маскоўскага. Аляксандраў прывілей 1492 г. Аслабленне каралеўскай і вялікакняжацкай улады ў Польшчы і ВКЛ у кантэксце фарміравання абсалютных манархій ў Еўропе. У будучым гэта фактар стаў фатальным. Унутраная і знешняя палітыка Аляксандра Ягелона. Пераход Вялікага княства да абароны ў адносінах да Масквы. Памежныя спрэчкі і ад'езды князёў. Страта тэрыторый. Няўдалы дынастычны шлюб Аляксандра з вялікай княжной Аленай Іванаўнай. Мяцеж Міхаіла Глінскага і яго вынікі. Алена Глінская – жонка Васіля III. Дынастычныя сувязі Вільні і Масквы.

### *Тэма 13. "Залаты век" Вялікага княства Літоўскага (першая палова XVI ст.)*

Унутрыпалітычная стабілізацыя краіны пры Жыгімонце I Старым. Адносіны з Маскоўскім княствам. Вялікае княства Літоўскае і Польшча. Эканамічная і адміністрацыйная дзейнасць Боны Сфорца на землях ВКЛ. Намаганні Боны Сфорцы па ўмацаванню цэнтральнай улады і забеспячэнню спадчыннасці трона за Жыгімонтам Аўгустам. Еўрапейскі ўплыў пры дварах Кракава і Вільні. Рэнесансная культура і побт. Пранікненне ідэй Рэфармацыі. Адносіны Польшчы і Вялікага княства. Дамінаванне ў ВКЛ Гаштольдаў і Радзівілаў. Намаганні Боны Сфорца замацаваць свій уплыў у ВКЛ і заручыцца іх падтрымкай. Абвяшчэнне Жыгімонта Аўгуста вялікім князем. Складанасці з абвяшчэннем каралем Польшчы. Незадаволенасць полтскіх магнатаў. Гісторыя з мазавецкімі князямі і непрыязнае стаўленне да Боны.

Мерапрыемствы Жыгімонта Аўгуста па вяртанню каронных зямель дзяржаве. Нарошчванне вялікакняжацкага дамена і даходаў з яго. Рэформа суда, скарбу, войска, што ў выніку адыгрывала на ўмацаванне цэнтральнай улады. Прывілей 1563 г. і ўраўнаванне ў правах католікаў і праваслаўных.

Адміністрацыйная рэформа. Аграрная рэформа (“Валочная памера”). Дынастычныя праблемы Жыгімонта Аўгуста. Адсутнасць нашчадкаў мужчынскага полу. Няўдалае і трагічнае сямейнае жыццё. Заўчасная смерць першай жонкі і смерць Барбары Радзівіл.

### *Тэма 14. Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XIII–першай палове XVI ст.*

Геапалітычнае становішча ВКЛ у сярэдзіне XIII ст. Неабходнасць фарміравання ядра дзяржавы. Крыжакі як асноўны праціўнік на паўночным захадзе. Намаганні Міндоўга наладзіць адносіны з Ордэнам. Галіцка-Валынскае княства як канкурэнт на паўдневым усходзе. Дыпламатыя Войшалка у адносінах да галіцка-валынскіх князёў. Барацьба супраць крыжакаў Трайдэна і Віценя. Барацьба з крыжакамі пры Гедыміне. Давыд Гарадзенскі. Адносіны с Польшчай. Дынастычны шлюб і ўдзел войскаў ВКЛ у паходзе супраць Брандэнбурга і Франкфурта-на-Одэры.

Узвышэнне Масквы і яе намаганні па збіранню зямель. Масква і Цвер. Саюз Цверы і Вільні. Паходы Альгерда на Маскву. Умяшальніцтва крыжакаў у дынастычныя складанасці Вялікага княства Літоўскага. Знешнепалітычныя прыярытэты ВКЛ пасля заключэння Крэўскай уніі. Барацьба Вітаўта за незалежнасць ВКЛ. Адносіны з Масквой. Вітаўт і Свяшчэнная Рымская імперыя. “Вялікая вайна” і Грунвальдская бітва. Адносіны з крыжакамі пасля Грунвальда. Скасаванне Лівонскага Ордэна. Адносіны з татарамі. Ардыншчына. Клецкая бітва і яе вынікі. Праблемы ва ўзаемаадносінах ВКЛ і Польшчы пры Казіміры Ягелончыку. Пераход да абароны у адносінах да Масквы. Серыя войн з Вялікім княствам Маскоўскім у пачатку XVI ст.

### *Тэма 15. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у XIV–XVI ст. Эвалюцыя аграрных адносін і запрыгоньванне сялян*

Структура землеўладання. Дзяржаўнае, гаспадарскан, царкоўнае землеўладанне. Працэс запрыгоньвання сялян у XV–XVI ст. Катэгорыі залежнага сялянства па крытэрыю магчымасці пераходу і выконваемым павіннасцям. Асаблівасці стану прамежкавых катэгорый насельніцтва: земян, сялян-слуг і баяр панцырных.

Пачатак аграрных ператварэнняў пры Боне Сфорцы. Аграрныя рэформы Жыгімонта II Аўгуста і увядзенне "валочнай памеры". Станаўленне фальварачна-паншчыннай гаспадаркі і яе месца ў эканаміцы і гандлі ВКЛ.

Магдэбургскае права і сістэма гарадскаго самакіравання. Рамёствы і гандаль і іх дынаміка ў X–XУI ст.

### *Тэма 16. Развіццё заканадаўства і права і судовай сістэмы на беларускіх землях (ад звычаёвага права да Статутаў ВКЛ)*

Звычаёвае права і яго рысы. Судовая працэдура ў X–XIII ст. "Руская праўда" і "Смаленская праўда" як першыя помнікі пісьмовага права: сацыяльная структура грамадства і яго прававыя катэгорыі.

СудзебнIк Казіміра 1468 г. і яго значэнне. Сістэма дзяржаўнай улады і судоў ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст. Віды судовых устаноў і іх паўнамоцтвы. Суды земскія, гродскія, замкавыя, падкаморскія. Копны суд. Заснаванне Трыбунала ВКЛ. Статуты ВКЛ 1529 і 1566 г., іх структура і змест. Статут ВКЛ 1588 г.: яго асноўныя палажэнні і значэнне для развіцця айчыннага і еўрапейскага права.

### *Тэма 17. Культура Вялікага княства Літоўскага ў XIV – першай палове XVI ст.*

Спецыфіка культурнага развіцця ВКЛ у нацыянальным, канфесійным і геапалітычным аспектах. Фарміраванне беларускага этнасу. Нацыянальныя меньшасці на тэрыторыі ВКЛ.

Беларускі Рэнесанс і яго асаблівасці ў параўнанні з заходнееўрапейскім. Дзейнасць Ф. Скарыны. Рэфармацыя. С. Будны. Развіцце архітэктуры. Грамадзянскае, абарончае, культавае будаўніцтва. Архітэктурныя стылі. Літаратура ВКЛ. М. Гусоўскі. Уплыў Заходняй Еўропы. Прыдворная культура як асяродак еўрапеізацыі. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. З’яўленне сармацкага партрэта і ідэалогіі сарматзму.

### *Тэмы 18-21: Палітычнае становішча ВКЛ у XVI ст.Утварэнне Рэчы Паспалітай. Рэч Паспалітая ў канцы XVI – пачатку.XVII стст.*

Жыгімонт Аўгуст. Лівонская вайна. Прычыны і пачатак баявых дзеянняў. Пераход Лівоніі пад пратэктарат ВКЛ. Ваенныя дзеяннні на тэрыторыі Беларусі. Захоп Полацка войскамі Івана Жахлівага. Перамогі войскаў гетмана ВКЛ Мікалая Радзівіла Рудога і гетмана польнага літоўскага князя Рамана Федаравіча Сангушкі над маскоўскімі войскамі ў 1564 і 1567 гг. Часовае перамір’е 1570 г. Стэфан Баторы і вызваленне Беларусі, завяршэнне Лівонскай вайны. Ям-Запольскае перамір’е. Вынікі вайны.

Імкненне беларускай шляхты ўратаваць незалежнасць ВКЛ ад спробы Івана Жахлівага захапіць беларускія землі. План федэратыўнага саюза з Польшчай. Сойм пад Віцебскам (1562 г.). Сепаратысцкі рух на ўкраінскіх землях. Польскі праект уніі. Апазіцыя беларускіх магнатаў польскаму праекту. Агульны сойм Польшчы і ВКЛ ў Любліне. Інкарпарацыя Падляшша і украінскіх ваяводстваў ў склад Польшчы. Барацьба беларуска-літоўскіх магнатаў супраць дзяржаўнай уніі. Мікалай Радзівіл Руды. Мікалай Радзівіл Чорны. Яўстафі Валовіч. Умовы уніі 1569 г. Стварэнне федэратыўнай дзяржавы – Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча ВКЛ у складзе РП. Органы ўлады і кіравання. Паступовая паланізацыя беларускай і літоўскай шляхты ў XVII-XVIII стст. Абмжаванне ўлады манарха. Асаблівасці палітычнай культуры Рэчы Паспалітай.

Становішча ў Беларусі ў першай палове XVII ст. Правядзенне валочнай памеры на Палессі і на усходзе Беларусі. Голад 1601-1602 гг. і яго адлюстраванне ў Баркулабаўскім летапісе. Удзел ВКЛ ў вайне паміж Рэччу

Паспалітай і Швецыяй ў 1600 – 1629 гг. Бітва пад Кірхгольмам ў 1605 г.. Альтмаркскі мір. Жыгымонт III Ваза і удзел у інтэрвенцыі ў Маскоўскую дзяржаву ў 1608-1618 гг. Падтрымка Ілжэдзмітрыя I і Ілжэдзмітрыя II, каралевіча Уладзіслава. Сямібаяршчына. Аблога Смаленска. Бітва пад Клушынам ў 1610 г. Капітуляцыя польска-літоўскага гарнізона ў Крамлі (восень 1612 г.). Паход каралевіча Уладзіслава на Маскву ў 1617-1618 гг. Дзеўлінскае перамір'е 1618 г. Далучэнне Смаленскага ваяводства да ВКЛ. Вайна Рэчы Паспалітай супраць Расіі 1632-1634 гг. Адмова Уладзіслава вазы ад прэтэнзій на рускі трон. Палянаўскі мір 1634 г.

### *Тэмы 22–24: Рэлігійнае становішча на Беларусі. Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Уніяцкая царква.*

Знаходжанне Беларусі на памежжы дзвюх хрысціянскіх канфесій. Становішча праваслаўнай і каталіцкай царквы. Манаскія каталіцкія ордэны на Беларусі. Стан праваслаўя ў ВКЛ. Патранат дзяржавы. Маральны і інтэлектуальны ўзровень духавенства. Крызіс праваслаўя ў РП.

Пратэстантызм і рэфармацыйны рух. Лютэранства,кальвінізм, сацыніянства, англіканства, цвінгліянства. Этапы Рэфармацыі на Беларусі. Асноўныя накірункі і прадстаўнікі. Пашырэнне кальвінізму на Беларусі. Роля магнатаў у гэтым працэсе. Пераход часткі праваслаўнай і каталіцкай шляхты і гараджан у кальвінізм.

Барацьба супраць Рэфармацыі ў Еўропе і Рэчы Паспалітай. Каталіцкая экспансія. Планы Ватыкана. Дзейнасць іезуітаў. Валяр'ян Пратасевіч. Іезуіцкія школы. Віленская акадэмія. Пётр Скарга. Поспехі і асаблівасці контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай. Пераход насельніцтва ў каталіцтва.

Берасцейская царкоўная ўнія. Мэты, ідэі і падрыхтоўка ўніі. Пазіцыя брацтваў. Згода часткі праваслаўных епіскапаў на заключэнне уніі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. Падзел удзельнікаў на два лагеры. Умовы уніі. Сутнасць уніяцтва. Адносіны кіруючых колаў Рэчы Паспалітай да уніяцтва. Ступень незалежнасці ўніяцкай царквы ад Масквы і Рыма. Роля ўніяцтва ў кансалідацыі грамадства.

Вытокі і формы барацьбы насельніцтва супраць уніі. Устанаўленне рэлігійнай нецярпімасці ў Рэчы Паспалітай ў XVII ст. Забойства Ясафата Кунцэвіча. Барацьба праваслаўнай шляхты на соймах за ўзнаўленне іерархіі праваслаўнай царквы. Дзейнасць брацтваў. Узнаўленне праваслаўнай мітраполіі ў Кіеве ў 1620 г. Прызнанне каралём Уладзіславам самастойнай праваслаўнай царквы на Украіне і Беларусі. Беларуская (Магілёўская) праваслаўная епархія.

### *Тэмы 26 – 27. Беларусь ў другой палове XVII– сярэдзіне XVIII стст. Войны і іх наступствы.*

Запарожскае і украінскае казацтва. Становішча казакаў пасля Люблінскай уніі. Рэестравыя казакі. Казацкі старшына. Гетманы. Барацьба супраць трайнога прыгнёту. Казацкі "экспарт" рэвалюцыі на Беларусь.

Гетман Б.Хмяльніцкі. пачатак вызваленчай вайны на Украіне. Рэйды казацкіх “загонаў” на Беларусь. Сялянскія паўстанні на Беларусі 1648-1649 гг. Ступень падрыхтаванасці кіраўніцтва Рэчы Паспалітай да адпору дзеянням паўстанцаў. Баі на поўдні Беларусі. Падаўленне паўстанняў войскамі Я. Радзівіла. Баі сялянскіх і казацкіх атрадаў вясной і ўлетку 1649 г. Паражэнне казацкіх і сялянскіх атрадаў на Беларусі. Бітвы пад Лоевам 1649 г. і Збораўскі мір. Аднаўленне баявых дзеянняў у 1651 г., бітва пад Лоевам. Узяцце Кіева войскамі Я. Радзівіла. Белацаркоўскі мір. Спыненне рэйдаў казакаў на Беларусь. Пераяслаўская рада і саюз Украіны і Расіі.

Прычыны вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. Напад трох расійскіх армій і казацкага войска на Беларуска-Літоўскую дзяржаву. Першы перыяд вайны. Абарона Мсціслава, Шклова, Крычава, Смаленска, Віцебска і іншых гарадоў. “Прысяжная шляхта”. Расправа царскіх войскаў з жыхарамі Мсціслава, Оршы, Магілева. Рабункі царскага і казацкага войскаў. Ваенныя дзеянні ў Вільні, Трокаў, Гародні, Коўна. Прыняцце царом Аляксеем Міхайлавічам тытула вялікага князя Вялікае, Малае і Белае Русі, гасудара і вялікага князя Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага і Смаленскага.

Напад Швецыі на Польшчу і Жамойцію. Часовы захоп шведамі амаль усёй Польшчы. Прапанова шведскага караля расійскаму цару падзяліць Рэч Паспалітую. Спроба уніі ВКЛ са Швецыяй (Кейданская ўнія). Перамір’е Расіі з Рэччу Паспалітай. Вайна Расіі супраць Швецыі. Вызваленне польскай і жамойцкай тэрыторыі ад шведаў. Спадзяванні беларускага насельніцтва на царскія войскі. Барацьба расійскіх войскаў супраць украінскіх казакоў на тэрыторыі Беларусі. Беларускія казацка-сялянскія атрады і рух “шышоў”. Падаўленне сялянскіх выступленняў. Царская палітыка ў дачыненні да розных груп насельніцтва. “Літоўскі палон”. Беларусы ў Маскве і іншых мясцовасцях Расіі. Эпідэміі і голад на Беларусі. Оліўскае пагадненне.Апошні перыяд вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. .Паўстанні гараджан супраць расійскіх войскаў. Выгнанне расійскіх войскаў з тэрыторыі Літвы і Беларусі. Андрусаўскае пагадненне.

Палітычнае становішча на Беларусі ў другой палове XVII ст. Барацьба магнацкіх груповак за уладу, за каралеўскі і вялікакняжацкі троны. Выбранне каралём Аўгуста (Моцнага) Саксонскага. Усеўладзе Сапегаў у Літве і Беларусі. Барацьба беларускай і літоўскай шляхты супраць Сапегаў у канцы XVII– пачатку XVIII ст. Канфедэрацыя 1696 г. і ўраўненне правоў шляхты. Выкарыстанне Сапегамі казацка-сялянскіх атрадаў у барацьбе супраць шляхты.

Паўночная вайна 1700–1721 гг. Паўночны саюз. Пачатак вайны. Шведы ў Літве. Баявыя дзеянні на Беларусі. Генеральная і Сандамірская канфедэрацыі. Адносіны беларуска-літоўскіх магнатаў і насельніцтва да ваюючых армій. Абранне каралём Рэчы Паспалітай С. Ляшчынскага. Шляхецкая канфедэрацыя, саюзная Пятру І. Увод расійскага войска на тэрыторыю Беларусі. Дзеянні рускай арміі. Альтраштацкі мір. Бітва пры

Лясной. Гетман Мазепа. Палтаўская бітва. Выгнанне шведаў з тэрыторыі Беларусі. Вынікі Паўночнай вайны для Беларусі.

Эканамічны стан Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. Стан сялянскай і панскай гаспадарак. Рост буйнога феадальнага землеўладання і яго структура. Каралеўскія эканоміі. Сельскае рамяство. Паступовае ўзнаўленне сельскай гаспадаркі. Пашырэнне плошчы запашкі. Катэгорыі сялян і іх становішча. Павіннасці сялян. Сялянскія паўстанні: Крычаўскае і на Каменшчыне.

Спусташэнне гарадоў і мястэчак падчас войнаў. Стан гарадоў і мястэчак: гарадское рамяство, гандаль і яго структура, гарадскія цэхі. Пашырэнне зямельнай уласнасці феадалаў у гарадах. Сацыяльныя групы насельніцтва ў гарадах.

Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай у XVIII ст. Канфедэрацыя ліцвінскай шляхты. Нямы сойм. Умяшанне замежных краін ва ўнутраныя справы дзяржавы і выкарыстанне імі магнацкіх груповак. Вяртанне на трон падчас Паўночнай вайны Аўгуста Моцнага. Барацьба паміж прыхільнікамі залатой вольнасці і ўзмацнення каралеўскай улады. Прысутнатнасць расійскага фактару ва ўнутраным жыцці Рэчы Паспалітай.П Падцвярджэнне расійскага патранату над праваслаўнай царквой на Беларусі. Роля Расіі ў абранні каралём і вялікім князем Аўгуста III. Кіраванне Аўгуста III, аслабленне цэнтральнай улады. Рэйды царскага войска на тэрыторыі ВКЛ. Стараверы. Крычаўскае паўстанне.

***Тэма 28–31 . Палітычнае становішча, эканоміка і культура Беларусі ў другой палове XVIII ст. Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі.***

Эканамічны ўздым на Беларусі ў сярэдзіне – другой палове XVIII ст. і яго прычыны. Развіццё сельскай гаспадаркі. Памешчыцкая гаспадарка. Узнікненне вотчынных мануфактур. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі. Зямельныя надзелы сялянства. Стан культуры земляробства, сельскагаспадарчыя прылады, сялянскія промыслы. Рыначныя сувязі беларускіх сялян. Суадносіны формаў рэнты. Дыферэнцыяцыя сялян на Беларусі. Стан вайскова-служылага насельніцтва і дробнай шляхты.

Гарады – цэнтры рамеснай і гандлёвай дзейнасці. Структура рамеснай вытворчасці, рост яе спецыялізацыі. Цэхі. Узнікненне зачаткаў капіталістычных адносін. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё шляхоў зносін. Рэформы кіруючых устаноў дзяржавы па паляпшэнню стану эканомікі. Павелічэнне колькасці яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках Беларусі.

Вытокі крызісу ў Рэчы Паспалітай. Аслабленне дзяржавы у выніку войнаў з Расіяй, Швецыяй, Турцыяй. Узмацненне ўлады магнатаў. Прыватныя войскі. Выбранцы і ардынацкая шляхта. Шляхецкая анархія. Права «ліберум вета». Правы шляхты на стварэнне канфедэрацый. Дачыненні Рэчы Паспалітай з прускім каралеўствам. Сямігадовая вайна і Рэч Паспалітая.

Барацьба паміж магнацкімі групоўкамі за каралеўскі трон пасля смерці Аўгуста III. Увод расійскіх войскаў у Рэч Паспалітую. Прэтэнзіі Кацярыны II

на паўночную і ўсходнюю часткі Беларусі. Абранне каралём і вялікім князем Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Барацьба з войскамі групоўкі Караля Радзівіла. Спроба групоўкі Чартарыйскіх правесці рэформы дзяржаўнага ладу. Супрацьдзеянне рэформам з боку Расіі і Прусіі. Змова Кацярыны ІІ і Фрыдрыха ІІ супраць Рэчы Паспалітай. Стварэнне Слуцкай і Торуньскай шляхецкіх канфедэрацый. Гарантыя Расіяй “кардынальных правоў”. Барская канфедэрацыя і яе барацьба за незалежнасць краіны. Расійскія войскі на Беларусі і ў Польшчы. А. Суવораў і яго баі супраць праціўнікаў падзелаў.

Саюз Аўстрыі,Прусіі і Расіі супраць Рэчы Паспалітай. Першы падзел. Далучэнне ўсходняй і паўночнай частак Беларусі да Расійскай імперыі.

Спроба правядзення рэформаў у Рэчы Паспалітай у 1770-я гг. Стварэнне шляхецка-буржуазнага блока ў 80-я гады XVIII ст. Чатырохгадовы сейм. “Закон аб урадзе”, палітычныя рэформы. Адміністрацыйная рэформа 1791 г. Кацярына ІІ і рэакцыйныя магнаты супраць рэформаў. Змова ў Пецярбургу. Таргавіцкая канфедэрацыя. Інтэрвенцыя расійскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне цэнтральнай часткі беларусі да Расіі. Сейм ў Гародне.

Пачатак шляхецкага рэвалюцыйнага перыяду ў гісторыі Беларусі. Паўстанне 1794 г. Тадэвуш Касцюшка. Якуб Ясінскі. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Прычыны паражэння паўстання і лёс яго ўдзельнікаў. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Адрачэнне С. А Панятоўскага. Далучэнне заходняй часткі Рэчы Паспалітай да Расіі.

Культура Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай. Паланізацыя. Пастанова сойма 1696 г. аб дзяржаўнай мове ВКЛ. Замойскі сабор уніяцкай царквы 1720 г. Ужыванне беларускай мовы ва ўніяцкай царкве. Аслабленне каталіцкага ўплыву з сярэдзіны XVIII ст ст. Забарона дзейнасці ордэна іезуітаў.

Асвета. Езуіцкія, дамініканскія і ўніяцкія навучальныя ўстановы. Заняпад брацкіх школ. Піярскія вучылішчы. Ідэі Асветніцтва на Беларусі. Галоўная школа ВКЛ. Адукацыйная камісія. Таварыства сяброў навукі. Гарадзенская лекарская школа. Ж. Э. Жылібер. Сярэдняя адукацыя. Пачатковая адукацыя. Батанічны сад. Уклад беларусаў ў развіццё культуры і навукі Расіі.

Дойлідства, архітэктура і выяўленчае мастацтва. Барока:этапы яго развіцця на Беларусі, Віленскае барока, ракако. Класіцызм. Дэкаратыўнае мастацтва. Афармленне інтэр’ераў. Ткацтва. Іканапіс і фрэскі. Свецкі жывапіс.

Тэатр і музыка. Прыдворныя магнацкія тэатры ў Слоніме, Слуцку, Шклове. Нясвіжская і Слонімская капэлы. Музычныя школы ў Гародні, Слоніме і Нясвіжы. Балетныя школы пры магнацкіх дварах. М.Радзівіл і У.Радзівіл. Творчасць Міхаіла Казіміра Агінскага і Міхаіла Клеафаса Агінскага. Народнае песеннае і харэаграфічнае мастацтва. Песні і маршы паўстанцаў 1794 г..

Літаратура. Шматмоўнасць літаратуры на Беларусі. Уклад нашых землякоў у польскую і рускую літаратуру. Сімяон Полацкі. Саламея

Пільштынова. Ульрык Радзівіл. Юльян Урсын Нямцэвіч. Францішак Багамолец.

### *Тэма 32. Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Палітыка урада Расійскай імперыі на далучаных землях*

Канфесійныя, нацыянальныя, палітычныя, сацыяльные і дзяржаўныя асаблівасці далучаных зямель. Новы адміністрацыйны падзел. Вывучэнне краю, апісанні і статыстычныя даследаванні. Будаўніцтва шляхоў і каналаў. Імкненне да найхутчэйшай эканамічнай інтэграцыі новых тэрыторый. Дыферэнцыраваная і абачлівая сацыяльная палітыка расійскага ураду. Мерапрыемствы у адносінах да шляхты і магнацтва. Асцярожная палітыка ў сферы канфесійных адносінаў.Ператварэнні ў структуры землеўладання і становішча розных катэгорый сялян. Адносіны да габрэяў і татар.

### *Тэма 33. Вайна 1812 г. і яе ўплыў на становішча беларускіх зямель*

Міжнароднае становішча ў Еўропе ў пачатку XIX ст. Удзел Расіі ў антыфранцузскіх кааліцыях. Тыльзіцкі мір. Нарастанне супярэчнасцей паміж Францыяй і Расіяй. “Польскае пытанне” ў дыпламатыі Напалеона I і Аляксандра I. Стварэнне Герцагства Варшаўскага. “План Агінскага”. Пачатак ваенных дзеянняў летам 1812 г. Баі на тэрыторыі Беларусі. Рускія арміі і іх задача. Злучэнне I і II армій каля Смаленска. Барадзінская бітва. Уваход Напалеона ў Маскву. Адносіны да вайны розных сацыяльных груп беларускага грамадства. Пазіцыя шляхты і магнатаў. Сяляне і іх дзеянні. Палітыка французскіх улад на акупіраванай тэрыторыі. Стварэнне Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага. Выгнанне французскай арміі з Расіі. Пераправа праз Беразіну. Вынікі вайны для розных груп насельніцтва беларускіх зямель.

### *Тэма 34. Шляхецкая рэвалюцыйнасць у канцы XVIII – першай палове XIX ст.*

Палітыка царскіх улад у дачыненні да магнатаў і шляхты ў пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі. Спробы рэформ дзеля прадухілення гібелі краіны. Эканаміныя рэформы. Чатырохгадовы сойм. Наладжванне адносінаў з Прусіяй. Занепакоенасць Кацярыны II распаўсюджаннем ідэй франузскай рэвалюцыі. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Паўстанне Т. Касцюшкі і яго значэнне. Палон Касцюшкі і вызваленне з палону пры Паўле I. Адносіны Паўла I і Аляксандра I да палякаў. Павел I – кавалер Мальтйскага ордэну, для якога палякі – еўрапейская нацыя. Сяюроўства Аляксандра I с Адамам Чартарыйскім. Праекты адраджэння Рэчы Паспалітай і аўтаноміі Вялікага княства Літоўскага. Значэнне стварэння Герцагства Варшаўскага. “План Агінскага”. Віленскі ўніверсітэт як асяродак ідэй адраджэння Рэчы Паспалітай. Філаматы і філарэты і іх ідэі. Масонства на тэрыторыі Беларусі. Дзекабрысты. Месца Вялікага княства Літоўскага ў планах дзекабрыстаў. Паўстанне 1830–1831 гг., яго прычыны, характар, рухаючыя сілы. Змены ў

палітыцы царскага ўрада пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. Грамадска-палітычны рух у 30-х-50-х гг. XIX ст. і яго плыні. Польская палітычная эміграцыя.

### *Тэма 35. Паўстанне 1830–1831 гг., яго вынікі і наступствы*

Стварэнне Царства Польскага, яго дзяржаўны лад і кіраванне. Прычыны напружанасці ў адносінах Царства Польскага і Расійскай імперыі. Зачэпка для паўстання 1830 г. Пачатак паўстання. Плыні сярод паўстаўшых. Перанясенне ваенных дзеянняў на заходнія губерніі Расійскай імперыі. Эмілія Плятэр. Сацыяльны склад паўстаўшых і праграма паўстання. Барацьба за Вільню. Ваенныя сілы паўстаўшых і рэгулярная армія Расійскай імперыі. Прычыны няўдач паўстаўшых і падаўленне паўстання. Змяненні ў палітыцы царскіх улад у адносінах Заходніх губерняў пасля падаўлення паўстання.

### *Тэма 36. Развіццё эканомікі беларускіх зямель ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.*

Сельская гаспадарка. Структура і віды землеўладання. Катэгорыі сялян. Галіны і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі па рэгіёнах. Крызіс прыгонніцтва і яго праявы. Сацыяльныя канфлікты на весцы. Віды сацыяльнага супраціву сялян. Захады царскага ўраду па паступовай адмены прыгоннай залежнасці. Рэфарматарская дзейнасць П.Д. Кісялева ў дзяржаўнай і памешчыцкай весцы і яе вынікі. Паступовая падрыхтоўка глебы для адмены прыгоннага права.

Прамысловасць, рамяство і фабрычная вытворчасць. Развіццё памешчыцкіх мануфактур. Першыя фабрыкі. Гарады і гандаль. Асноўныя формы гандлю. Віды гандлевых шляхоў.

### *Тэма 37. Культура Беларусі першай паловы XIX ст.*

Спецыфіка рэгіёна. Народная і шляхецкая культура. Уплыў Расіі і праваслаўнай царквы. Сістэма адукацыі. Віленская навучальная акруга і Віленскі ўніверсітэт. Змены ў адукацыйнай палітыкі на працягу першай паловы XIX ст. Развіцце навуковых ведаў. Краязнаўства, беларусазнаўства (А. Кіркор, П. Шпілеўскі і інш.) Стварэнне першага беларускага музея ў Лагойску і адкрыццё Віленскага музея старажытнасцяў (К. і Я. Тышкевічы). Літаратура. Рамантызм. А. Міцкевіч, П. Багрым, В. Дунін-Марцынкевіч і інш. Паэма “Тарас на Парнасе”. Мастацтва. В. Ванькові́ч, І. Хруцкі. Тэатр. В. Дунін-Марцынкевіч і яго п’есы. Музыка А. Абрамовіча і С. Манюшкі.

### *Тэма 38. Адмена прыгоннага права і буржуазныя рэформы на тэрыторыі Беларусі*

Неабходнасць комплекснага рэфармавання Расіі пасля паражэння ў Крымскай вайне. Праекты адмены прыгоннага права. Маніфест 19 лютага 1861 г. і мясцовыя палажэнні. Змест рэформы і механізм яе правядзення. Асаблівасці правядзення адмены прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі і ў сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. Цэнзурная і школьная рэформы і іх вынікі. Сістэма пачатковай і сярэдняй адукацыі ў Беларусі. Ваенная і судовая

рэформы. Асаблівасці правядзення судовай рэформы ў беларускіх губернях. Земская і гарадская рэформы. Праблема земстваў на тэрыторыі беларускіх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гг.

### *Тэма 39. Паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага*

Перадумовы паўстання. Варшава і Вільня як цэнтры нацыянальна-вызваленчага руху. Праблема надання аўтаноміі Заходнім губерням. Палітычныя супярэчнасці ў Царстве Польскім. Паўстанне ў Варшаве ў студзені 1963 г. "Чырвоныя" і "белыя" і іх праграмы. Мэты і задачы паўстаўшых, іх сацыяльны склад і мерапрыемствы. Дзейнасць К. Каліноўскага і яго роля ў падрыхтоўцы і правядзенпі паўстання. Ідэі “Мужыцкай праўды”. Пачатак і ход паўстання на тэрыторыі беларускіх губерній. Рэйд Л. Звяждоўскага па Магілёўшчыне. Барацьба “чырвоных” і “белых”. Вынікі паўстання і прычыны яго паражэння. Палітыка царскіх улад пасля падаўлення паўстання. Сістэма Мураўева. Змяненне ўмоў адмены прыгоннага права. Вяртанне сялянам адрэзаных зямель і хуткае правядзенне выкупной аперацыі. Закрыццё Горы – Горацакга земляробчага інстытута. Еўрапейскі і расійскі рэзананс вынікаў паўстання.

### *Тэма 40. Развіццё эканомікі Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст.*

Значэнне адмены прыгоннага права для эканамічнага развіцця Расійскай імперыі. Змены ў структуры землеўладання. Метады вядзення сельскай гаспадаркі ў парэформенны час. Рэгіянальная дыфереэцыяцыя па галінах сельскай гаспадаскі і формах сялянскага землеўладання. Галіновая структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Галіновая структура прамысловасць. Формы арганізацыі прамысловасці. Асаблівасці нацыянальнага складу рабочага класу. Урбанізацыя. Гандаль, яго структура і формы. Шляхі зносін. Рэкі і каналы. Будаўніцтва чыгункі. Уступленне капіталізма ў манапалістычную стадыю. Банкаўскі капітал. Манапалістычныя аб’яднанні. Сацыяльныя наступствы урбанізацыі і тэхнічнага пераварота. Складанне класаў буржуазнага грамадства. Крыніцы фарміравання пралетарыята і яго нацыянальны склад. Пачатак рабочага заканадаўства.

### *Тэма 41. Грамадска-палітычны рух у апошняй чвэрці XIX–пачатку XX ст.*

Фарміраванне класаў буржуазнага грамадства, ідэалогіі барацьбы за нацыянальнае вызваленне, эканамічныя і палітычныя правы. Народніцкія арганізацыі. Група “Гоман”, яе ідэі і дзейнасць. “Хаджэнне ў народ” і яго вынікі. Плыні сярод народнікаў. Няўдача прапаганды і фарміраванне ідэі палітычнага тэрору. Забойства Аляксандра II 1 сакавіка 1881 г. Вынікі забойства цара для народніцкіх арганізацый. Стварэнне партыі эсэраў. Палітычная праграма эсэраў. Прычыны папулярнасці эсэраў у Беларусі.

Сацыял-дэмакратычная ідэя. “Маніфест Камуністычнай партыі” і яго змест. Распаўсюджанне марксізма ў Заходняй Еўропе і Расіі. Стварэнне сацыял-дэмакратычных партый. Група “Вызваленне працы”. І з’езд РСДРП.

Падзел сацыял-дэмакратаў на бальшавікоў і меньшавікоў. “Бунд” як сацыял-дэмакратычная і нацыянальна-вызваленчая партыя габрэяў. Сіяніцкі рух. “Беларуская сацыялістычная грамада” і яе праграма. Газета “Наша ніва”

Ліберальныя партыі. Кадэты (Партыя народнай свабоды) і іх праграма. Акцябрысты. “Рускае ўскраіннае таварыства”, “Саюз рускага народа” і іх ідэалогія. Ідэі “краевасці” ў заходніх губернях.

### *Тэма 42. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і яе падзеі на тэрыторыі Беларусі*

Прычыны і зачэпка да пачатку рэвалюцыі. “Крывавая нядзеля” і яе наступствы. Пачатак палітычных стачак у Расіі, Польшчы, заходніх губернях Расійскай імперыі. Стварэнне Саветаў. Нарастанне рэвалюцыі летам 1905 г. Кастрычніцкая палітычная стачка. Маніфест 17 кастрычніка і яго значэнне для палітычнага і грамадскага развіцця Расіі. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Дыферэнцыяцыя палітычных сіл. Стварэнне партыі акцябрыстаў. Скліканне Першай Дзяржаўнай Думы. Партыйнае прадстаўніцтва ў Першай Думе. Дэлегаты ад беларускіх губерняў у Першай Думе.

Рабочае заканадаўства, адмена выкупных плацяжоў, дэмакратызацыя і ажыўленне нацыянальнага руху. Другая Дума, яе склад і канфрантацыя з урадам. Пераварот 3 чэрвеня. Значэнне Першай рускай рэвалюцыі.

### *Тэма 43. Становішча у Расіі і Беларусі ў 1907–1914 гг. Сталыпінская аграрная рэформа*

Усталяванне рэакцыі ў Расійскай імперыі. Трэцяя Дума, яе склад і праца. Мерапрыемствы П. А. Сталыпіна на пасадзе старшыні Савета міністраў і міністра унутраных спраў. Дзейнасць палітычных партый ва ўмовах рэакцыі. Пазіцыя БСГ і “Нашай нівы”.

Эканамічнае развіцце Расіі і беларускіх губерній. Эканамічны рост напярэдадні Першай сусветнай вайны. Прамысловая спецыялізацыя беларускіх губерній. Банкі і манаполіі. Урбанізацыя. Развіццё чыгункі.

Мэты сталыпінскай аграрнай рэформы. Меры па разбурэнню абшчыны, павышэнню культуры земляробства, перасяленні ў Сібір. Выніковасць рэформы. Асаблівасці праходжання аграрнай рэформы ў Беларусі.

### *Тэма 44. Беларусь у часы Першай сусветнай вайны*

Прычыны і пачатак Першай сусветнай вайны. Складанне Антанты і Траістага саюза. Забойства ў Сараеве і эскалацыя міжнароднага крызіса. Роля Расіі ў пачатку вайны. Мерапрыемства царскага ўраду па арганізацыі жыцця краіны на ваенны лад. Мабілізацыя і яе ход. Пераход да картачнай сістэмы. Прыцягненне насельніцтва да будаўніцтва абарончых рубяжоў. Адносіны да вайны розных партый і сацыяльных груп.

Становішча Беларусі яе прыфрантавой тэрыторыі. Бежанства. Мабілізацыі насельніцтва. Размяшчэнне і праход войскаў. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі і іх вынікі. Свянцянскі прарыў. Нарачская аперацыя. Баі пад Смаргонню. Акупацыя Беларусі германскімі войскамі. Беларускі

нацыянальны рух падчас вайны. Дзейнасць Камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны. Сельская гаспадарка і прамысловасць Беларусі падчас вайны. Дзейнасць палітычных партый. Агітацыя на фронце. Паглыбленне эканамічных і сацыяльных праблем на працягу ваеннага часу.

***Тэма 45. Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі і на тэрыторыі Беларусі***

Наспяванне палітычных праблем падчас вайны. Пазіцыйная вайна. Апазіцыя царскай уладзе ў вялікакняжацкім асяроддзі. Хваляванні і маніфестацыі ў Петраградзе. Пашырэнне рэвалюцыйнага руху з уключэннем у яго арміі і генералітэта. Адрачэнне Мікалая II.

Усталяванне дваяўладдзя. Стварэнне Часовага Урада і Выканкама Петраградскага савета. Саветы і камітэты Часовага ўрада на месцах. Дэмакратызацыя арміі і стварэнне салдацкіх і матросскіх камітэтаў. Агітацыя бальшавікоў у арміі. Барацьба палітычных сіл за лідэрства ў рэвалюцыі. Беларускі нацыянальны рух і падняцце пытання аб нацыянальным самавызначэнні беларусаў.

***Тэма 46. Палітычнае становішча ў Расіі і Беларусі вясной-восенню 1917 г.***

Галоўныя праблемы развіцця Расіі пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Невырашанасць аграрнага і нацыянальнага пытанняў, выхаду з вайны. Палітычныя партыі і іх праграмы. Роля партыі бальшавікоў.

Альтэрнатыўнасць развіцця краіны пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Крызісы Часовага урада. Дзяржаўная нарада і план усталявання ваеннай дыктатуры. Мэта карнілаўскага мяцежа і яго зрыў. Роля партыі бальшавікоў у барацьбе з карнілаўшчынай. Беларусь як цэнтр барацьбы з карнілаўскім мяцяжом і бальшавіцкай агітацыі ў арміі. Бальшавізацыя саветаў. Наспяванне рэвалюцыйных падзей.

***Тэма 47. Культура другой паловы XIX–пачатку XX ст. Рух за нацыянальнае адраджэнне. “Наша Ніва”***

Умовы развіцця культуры ў беларускіх губернях. Ідэйныя плыні ў грамадскай думцы. “Заходнерусізм”. Сістэма адукацыі і яе змест. Класічныя і рэальныя гімназіі. Адсутнасць вышэйшых навучальных устаноў. Развіцце беларусазнаўства (П. Шэйн, Я. Карскі, І. Насовіч, А. Сапуноў і г.д.). Гістарычныя ўмовы разгортвання нацыянальнага адраджэння. “Наша ніва” і накірункі яе дзейнасці. В. Ластоўскі і яго “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі”. Беларуская літаратура другой паловы XIX–пачатка XX ст. (Ф. Багушэвіч, М. Багдановіч, Я. Купала, К. Буйло, Цетка, Ядвігін Ш. і інш.) Мастацтва (Ю. Пэн, М. Шагал, Н. Орда, А. Гараўскі, М. Сілівановіч і г.д.).Тэатр і музыка.

***Тэма 48. Асаблівасці этнічнага і канфесійнага складу насельніцтва Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.***

Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць насельніцтва беларускіх губерняў. Колькасць, пераважнае месца жыхарства, сацыяльны статус, веравызнанне, прафесійныя заняткі наступных нацыянальных супольнасцей. Беларусы. Палякі. Габрэі. Рускія. Татары. Цыганы. Літоўцы. Палітыка царскага ўрада ў нацыянальным пытанні. Нацынальныя палітычныя партыі і культурнае адраджэнне ў пачатку XX ст.

## Раздзел IV. Беларусь у найноўшы час (XX – першая чвэрць XXI ст.)

### *Тэма 49. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі*

Узрастанне сацыяльна-палітычнага крызісу восенню 1917 г. і дзейнасць палітычных партый. Скліканне Паўночна-Заходняй канферэнцыі і выбары Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б). Стварэнне ў ліпені 1917 г. Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый. Абвяшчэнне Вялікай Беларускай Рады ў верасні 1917 г. Размежаванне БСГ. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

Узброенае паўстанне ў Петраградзе. II Усерасійскі з’езд Саветаў і яго рашэнні. Узброенае паўстанне ў Мінску. Стварэнне ВРК Заходняй вобласці і фронту і яго кіраўніцтва (А. Мяснікоў, В. Кнорын, К. Ландэр і інш.) Стварэнне “Камітэта выратавання рэвалюцыі” ў Мінску і барацьба супраць бальшавікоў. Усталяванне савецкай улады ў Магілеве. Стварэнне Аблвыкамзаха і Савета народных камісараў. Мерапрыемствы савецкай улады.

Выбары ва Устаноўчы сход і іх вынікі. Скліканне Усебеларускага з’езда і яго лёс. Ваенные дзеянні корпуска Ю. Доўбур-Мусніцкага.

### *Тэма 50. Германская акупацыя і Брэсцкі мір. Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе Рады*

Выхад з вайны яе галоўная задача бальшавікоў. Мірныя перамовы ў Брэст-Літоўску і іх зрыў. Наступленне германскіх войскаў. Эвакуацыя савецкага ўрада ў Смаленск. Пазіцыя Выканкама Усебеларускага з’езда па пытанні міру з Германіяй. Выданне I Устаўнай граматы. Фарміраванне Народнага сакратарыяту на чале з Я. Варонкай.

Наступленне германскіх войскаў і выданне СНК дакрэта “Сацыялістычная Айчына ў небяспецы!” Падпісанне Брэсцкага міру. Выданне II Устаўнай граматы і яе змест. Адносіны Рады БНР з акупацыйнымі ўладамі. Прыняцце III Устаўнай граматы і абвяшчэнне незалежнасці БНР. Цяжкасці становішча БНР унутры краіны і за мяжой. Накіраванне тэлеграмы Вільгельму II і алітычны крызіс у БСГ і Радзе БНР. Дзейнасць Рады БНР у галіне мясцовага кіравання, адукацыі, культуры, на міжнароднай арэне. Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі і скасаванне Брэсцкага міру. Заканчэнне германскай акупацыі і лёс БНР. Ацэнка БНР у беларускай гістарыяграфіі.

### *Тэма 51. Утварэнне БССР і ЛітБел*

Праблема нацыянальнага самавызначэння беларускага народа і спрэчкі вакол яе. Пазіцыі СНК, Аблвыкамзаха і Белнацкома. Намаганні Белнацкома і беларускіх секцый РКП(б) па рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Рашэнні VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі і абвяшчэнне яе І з'ездам КП(б)Б. Маніфест аб утварэнні БССР. Склад урада і пераезд яго ў Мінск. Ускладненне знешнепалітычнага становішча і прычыны стварэння ЛітБел. Барацьба вакол стварэння ЛітБел. ЛітБел і яе гістарычны лёс.

### *Тэма 52. Беларусь падчас грамадзянскай і савецка-польскай войн*

Грамадзянская вайна і палітыка "ваеннага камунізму".Перадгісторыя савецка-польскага канфлікту. Польшча і Антанта. Пачатак савецка-польскай вайны. Польскі акупацыйны рэжым і партызанскі рух на акупіраваных тэрыторыях. Беларускі нацыянальны рух ва ўмовах савецка-польскай вайны. Вынікі стасункаў дзеячаў беларускага нацыянальнага руху і Ю. Пілсудскага.

Польскае наступленне вясной 1920 г. і прарыў савецкімі войскамі польскага фронту на Украіне. Наступленне савецкіх войскаў і ўваход савецкіх войскаў на тэрыторыю Польшчы. Мерапрыемствы савецкага ўраду па распаўсюджванню рэвалюцыі на захадзе і рэакцыя на гэта заходніх краін. Варшаўская аперацыя і яе вынікі. Беларускі нацыянальны рух падчас савецка-польскай вайны. Дзейнасць эсэраў. Мірныя перамовы і заключэнне прэлімінарнага дагавора ў кастрычніку 1920 г. Ваенны мяцеж С. Булак-Балаховіча і яго вынікі. Перадумовы Слуцкага паўстання і яго сацыяльная база. Вынікі Слуцкага паўстання. Скасаванне ЛітБел і другое абвяшчэнне БССР. Рыжскі мірны дагавор і яго ўмовы.

### *Тэма 53. БССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі (1921-1927). Узбуйненне тэрыторыі БССР. Беларусізацыя*

Эканамічнае і сацыяльна-палітычнае становішча ў Беларусі пасля заканчэння грамадзянскай вайны. Праблема раз'яднанасці беларускіх зямель. Узбуйненне БССР. Удзел Беларусі у стварэнні СССР.

Сутнасць НЭПа. Мерапрыемствы НЭПа у сельскай гаспадарцы, прамысловасці і фінансах. Рэформы ў кіраванні прамысловасцю. Рэканструкцыя гаспадаркі, пачатак разгортвання індустрыялізацыі. Суадносіны дзяржаунага і прыватнага капіталу. Грашовая рэформа, ўвядзенне чырвонца. План ГОЭЛРО Станоучыя вынікі, супярэчнасці і недахопы НЭПа. Прычыны згортвання НЭПа.

Грамадска-палітычнае жыццё у 20-я гг.. Дзейнасць саветаў, камсамола, нацыянальных, жаночых арганізацый. Умацаванне ўлады бальшавікоу, згортванне дзейнасці іншых партый, усталяванне манаполіі на ідэйнае жыццё, фарміраванне партыйнай эліты. "Ленінскі заклік" у партыю і змяненне яе сацыяльнага складу. Барацьба за ўладу пасля смерці У.І.Леніна. Палітыка КП(б)Б у адносінах да інтэлігенцыі і па нацыянальна-культурным пытанні.

Крыніцы, мэты і накірункі палітыкі беларусізацыі. Мерапрыемствы ў галіне адукацыі, дзяржаунага кіравання, культуры, дзяржаўных моў і інш. Культурнае жыццё ў перыяд беларусізацыі. Стварэнне Інбелкульта і яго дзейнасць. Беларуская навука у 20-я гг. Развіццё літаратуры. Станаўленне беларускага тэатра. Выяўленчае і музычнае мастацтва. Барацьба з рэлігіяй і узмацненне ідэалагічнага ціску ў культурным жыцці. Згортванне беларусізацыі і яго прычыны.

### *Тэма 54–55. БССР у канцы 20-х-30-я гг. Індустрыялізацыя і калектывізацыя. Станаўленне каманднa-адміністрацыйных метадаў кіравання грамадствам.*

Зацвярджэнне сталінскай мадэлі будаўніцтва сацыялізму. Прынякцце першага пяцігадовага плана і яго карэкціроўкі. Сутнасць, асаблівасці і сродкі правядзення савецкага варыянта індустрыялізацыі. Асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Змены ў грамадстве і сацыяльная палітыка дзяржавы. Вынікі і пяцігодкі і прынякцце другога пяцігадовага плана і мерапрыемствы па яго выканані. Суадносіны планавання і рэальных паказчыкаў. Усталяванне рэпрэсіўных метадаў кіравання эканомікай і спалучэнне іх з працоўным энтузіязмам. Вынікі першых пяцігодак.

Перадумовы калектывізацыі. Кааперацыя. Хлебанарыхтоўчы крызіс і пераход да фарсіраванай калектывізацыі. Дырэктыўныя і рэпрэсіўныя метады правядзення калектывізацыі. "Вялікі пералом" 1929 г. Прышчэпаўшчына і партыйныя чысткі ў БССР. Супраціўленне насельніцтва. Артыкул І.В.Сталіна "Галавакружэнне ад поспехаў" і яго наступствы. Завяршэнне калектывізацыі і яго вынікі.

Перадумовы і прычыны ўсталявання таталітарнай сістэмы і культу асобы Сталіна. Ідэалагічнае абгрунтаванне рэпрэсіўнай палітыкі. Актывізацыя рэпрэсій пасля забойства С.М.Кірава. Рэарганізацыя дзейнасці судовых органаў. Хваля рэпрэсій 1935-1938 гг. і знішчэнне апанентау Сталіна ў ВКП(б). Прынякцце Канстытуцыі 1936 г., механизм правядзення выбараў і фарміравання дзяржапарату ў СССР і БССР. Рэпрэсіі ў БССР ў адносінах да партыйнага кіраўніцтва і нацыянальнай інтэлігенцыі. Ратацыі і знішчэнне партыйнага кіраўніцтва БССР. Рэпрэсіі ў арміі. Канчатковае ўсталяванне таталітарнай сістэмы, яе асаблівасці і сацыяльна-псіхалагічная аснова. Агульныя лічбы рэпрэсій, разгляд праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі.

Разгортванне культурнай рэвалюцыі, барацьба з непісьменнасцю, падрыхтоўка савецкай інтэлігенцыі, згортванне беларусізацыі. Рэарганізацыя вышэйшай школы, развіццё беларускай навукі і ўплыў на яе палітычных рэпрэсій. Дэнацыяналізацыя і рэформа беларускага правапісу.

Літаратурнае жыццё і ўплыў на яго таталітарнай сістэмы. Творчасць Я.Коласа, Я.Купалы, К.Крапівы, П.Глебкі і інш. Рэпрэсіі ў галіне літаратуры (А.Бабарэка, М.Гарэцкі, І.Дубоўка, Я.Дыла, С.Астрэйка, М.Лужанін і інш.). Развіццё беларускага тэатра. Музычнае і выяўленчае мастацтва, архітэктура і

будаўніцтва, станаўленне кіно, палітычная накіраванасць культурна-асветніцкіх арганізацый. Палітыка дзяржавы ў адносінах да царквы і рэлігіі.

### *Тэма 56. Заходняя Беларусь у 1919-1939 гг. Пачатак Другой сусветнай вайны. Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР.*

Вынікі савецка-польскай вайны і Рыжскі мір. Уключэнне заходнебеларускіх зямель ў склад Польшчы. Эканамічная палітыка польскага ўрада. Аграрнае пытанне і стан сельскай гаспадаркі. Асадніцтва. Зямельная рэформа. Палітыка нацыянальнай і дзяржаўнай асіміляцыі і заканадаўства польскіх ўлад ў галіне адукацыі. Стан асветы і культуры ў Заходняй Беларусі. Эміграцыя з Заходняй Беларусі.

Расстаноўка сацыяльна-палітычных сіл. Дзейнасць Беларускага пасольскага клуба і ўтварэнне Беларускай сялянска-рабочай грамады. Утварэнне КПЗБ. Дзейнасць камсамола Заходняй Беларусі. Беларускія эсэры і утварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Дзейнасць Таварыства беларускай школы. Польскія і яурэйскія партыі. Партызанская барацьба і яе сацыяльная база. Рэпрэсіуныя мерапрыемствы польскіх улад. Разгром БСРГ і дзейнасць клуба "Змаганне".

Выступленні працоўных Заходняй Беларусі падчас сусветнага эканамічнага крызісу. Сялянскі рух. Стварэнне антыфашысцкага народнага фронту. Выданне газеты "Наша воля". Выступленні нарачанскіх і браслаўскіх рыбакоў. Складанасці ўтварэння адзінага народнага фронту. Уплыў на вызваленчы рух у Заходняй Беларусі палітыкі Камінтэрна і палітычных рэпрэсій у БССР. Ліквідацыя КПЗБ і лёс яе дзеячаў.

Уплыў міжнароднага становішча на сітуацыю ў грамадстве. Пакт Молатава — Рыбентропа і сакрэтны пратакол да яго. Ідэалагічная работа савецкай улады напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пачатак Другой сусветнай вайны. Увядзенне савецкіх войскаў на тэрыторыю Заходняй Беларусі і далучэнне яе да БССР. Дагавор аб сяброўстве і межах. Мерапрыемствы савецкай улады на заходнебеларускіх тэрыторыях.

### *Тэма 57–60. Беларусь ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасляваеннае аднаўленне*

Мабілізацыя эканомікі і ідэалагічная работа савецкай улады напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Стварэнне Заходняй Асобай ваеннай акругі.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. План "Барбароса". Суадносіны сіл СССР і Германіі. Становішча войскаў Заходняй Асобай ваеннай акругі. Страты савецкай авіяцыі. Пагранічныя баі Чырвонай Арміі. Абарона Брэсцкай крэпасці. Першыя паветраныя тараны савецкіх лётчыкаў. Наступление нямецкіх войскаў і ўзяцце Мінска. Адступленне савецкіх войскаў. Перабудова жыцця БССР на ваенны лад. Мабілізацыя. Эвакуацыя. Лес Заходняй Асобай ваеннай акругі. Прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі ў пачатковы перыяд вайны.

Акупацыя Беларусі. План "Ост". Адміністрацыйнае кіраванне на акупіраваных тэрыторыях. Эканамічныя мерапрыемствы і аграрная палітыка германскіх улад. Знішчэнне і вываз культурных каштоўнасцей. Арганізацыя тэрору, этнічных чыстак і рэпрэсій сярод насельніцтва. Стварэнне лагераў смерці і гета. Халакост. Вываз насельніцтва ў Германію.

Стварэнне фашысцкай адміністрацыі на месцах. Калабарацыя і яе прычыны. Нацысцкая прапаганда. Стварэнне маладзёжных прафашысцкіх арганізацый, кірункі і змест акупацыйнай палітыкі ў галіне адукацыі. Беларускі нацыянальны рух у перыяд акупацыі, яго палітычны ідэал і формы дзейнасці. Стасункі паміж акупацыйнымі ўладамі і беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі.

Арганізацыя партызанскага і падпольнага руху на акупіраванай тэрыторыі. Першыя партызанскія і падпольныя фарміраванні. Мэты, формы і змест дзейнасці партызан і падпольшчыкаў. Мінскае падполле. Забойства В.Кубэ. Стварэнне партызанскіх зон і партызанскіх краёў. Падрыхтоўка партызанскіх кадраў. Рэйкавая вайна, яе этапы і вынікі. Каардынацыя дзейнасці партызан і аперацый Чырвонай АрмИ. Карныя аперацыі акупантаў супраць партызан і падпольшчыкаў. Гераізм удзельнікаў партызанскага і падпольнага руху.

Пачатак вызвалення Беларусі. Першыя аднаўленчыя мерапрыемствы. Аперацыя "Баграціён", яе мэты, ход і сродкі выканання. Дзейнасць Арміі Краёвай. Прычыны супярэчнасцей Арміі Краёвай і савецкага камандавання. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх войскаў. Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, яе крыніцы і значэнне.

Становішча Беларусі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Ацэнка людскіх і матэрыяльных страт. Узмацненне рэпрэсіўнага рэжыму і ідэалагічнага ціску, узрастанне культу асобы Сталіна. Выбар пасляваеннай мадэлі развіцця сацыялізму і. зацвярджэнне планаў чацвертай пяцігодкі. Узмацненне ціску дзяржавы ў аграрным сектары, вяртанне да калгаснай сістэмы. Узбуйненне калгасаў.

Грамадска-палітычнае становішча ў краіне. Узмацненне культу асобы Сталіна, нацыянальныя і ідэалагічныя прыярытэты, рэпрэсіі і ўціск асобных груп насельніцтва. Палітыка ў адносінах да праваслаўнай і каталіцкай царквы. Ідэалагічны ціск у навуцы, літаратуры, мастацтве, друку.

Абгрунтаванне прадстаўніцтва БССР у ААН. Удзел беларускіх прадстаўнікоў у заснаванні і дзейнасці ААН.

### *Тэма 61. Беларусь у 50-х-60-х гг. XX ст. Спробы рэформ. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя.*

Барацьба за ўладу пасля смерці І.В.Сталіна і перамога М.С.Хрушчова. Партыйнае кіраўніцтва К.Т.Мазурава ў БССР. Змены ў эканамічнай і сацыяльнай палітыцы ў бок дэмакратызацыі. Паляпшэнне матэрыяльнага становішча гарадскога і сельскага насельніцтва. Эканамічныя

рэформы. Стварэнне саўнаргасаў. Капітальнае і жыллёвае будаўніцтва. Задачы шостай пяцігодкі і сямігодкі.Укараненне дасягненняў НТР, асваенне космасу і стварэнне новых галін прамысловасці. Сацыяльныя змены ў грамадстве, колькасны і якасны рост рабочага класа, павелічэнне ўдзельнай вагі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Урбанізацыя. Вынікі прамысловага развіцця і магчымасці экстэнсіўнага росту эканомікі.

Мерапрыемствы ў галіне сельскай гаспадаркі. Павелічэнне закупачных цэн, скасаванне даўгоў калгасаў, пачатак стварэння сацыяльнай інфраструктуры на вёсцы. Адміністрацыйныя рэформы і сельскагаспадарчыя кампаніі другой паловы 50х гг. і іх вынікі. Сельскагаспадарчы крызіс пачатку 60х гг. і яго наступствы.

Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё падчас "адлігі". XX з'езд КПСС і яго значэнне. лібералізацыя ў галіне культуры і грамадскага жыцця. Узмацненне русіфікацып ў БССР. Спроба адстаўкі М.С. Хрушчова у 1957 г. Разгортванне рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій часоў сталінізму. Супярэчнасці "накіроўваемай дэсталінізацыі". Адстаўка М.С.Хрушчова, яе прычыны і наступствы.

### *Тэма 62. БССР у 70-х – першай палове 80-х гг.Крызіс грамадска-палітычнага і эканамічнага ладу СССР*

Змяненні ў кіраўніцтве СССР і БССР пасля прыходу да ўлады Л.І. Брэжнева. П.М.Машэраў на чале кіраўніцтва БССР. Змест паняцця "застой". Эканамічныя прыярытэты ўрада. Гаспадарчая рэформа 1965 г. і яе вынікі. Прамысловае развіццё БССР, стварэнне новых прадпрыемстваў і галін, вычарпанне магчымасцей экстэнсіўнай мадэлі. Прыярытэты дзевятай і дзесятай пяцігодак. Крыніцы адноснай стабільнасці савецкай эканомікі. Узмацненне адміністрацыйных метадаў кіравання і цэнтралізацыі эканомікі. Стварэнне Дзяржснаба, Дзяржкамцэн, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы і інш. Бюракратызацыя эканамічнага кіравання. Спробы эканамічнага рэфармавання (увядзенне брыгаднага падраду, прыняцце закона аб працоўным калектыве, стварэнне навукова-вытворчых структур інш.). Праявы і прычыны адставання савецкай эканомікі.

Складанасці ў сельскай гаспадарцы, нізкая рэнтабельнасць аграрнай галіны і яе прычыны. Капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку і спробы яе рэфармавання. Стварэнне аграпрамысловых комплексаў і крызісны стан сельскай гаспадаркі. Прыняцце Харчовай рэформы.

Грамадска-палітычнае жыццё СССР і БССР. Змены ў сацыяльнай структуры і адукацыйным узроўні савецкага грамадства. Згортванне лібералізацыі. Ідэалагічныя прыярытэты ў культуры, адукацыі, навуцы, выхаванні і прапагандзе, манаполія КПСС і КПБ на інфармацыю. Фармальная дзейнасць саветаў і прафесійных саюзаў. Дысідэнцтва ў СССР і БССР і барацьба з ім. Русіфікацыя ў галіне адукацыі і культуры БССР. Паглыбленне крызсных з'яў пры Ю.У. Андропаве і К. У. Чарненка.

Агульныя умовы развіцця культуры. Адукацыя. Павелічэнне колькасці вышэйшых навучальных устаноў. Рэфармаванне сярэдняй школы. Прафесійна-тэхнічная адукацыя. Паступовае страчванне адукацыяй БССР нацыянальнага зместу. Палітызацыя і ідэалагізацыя гуманітарных навук. Асноўная тэматыка твораў літаратуры і мастацтва ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі і на працягу 70-80х гг. Беларуская проза і паэзія. Архітэктура, скульптура, музыка, тэатр, кіно.

Міжнародная дзейнасць БССР у ААН і іншых міжнародных арганізацыях.

### *Тэма 63. Палітычныя падзеі ў другой палове 1980-х гг. Спроба перабудовы сацыяльна-эканамічнай сістэмы грамадства.*

Нарастание крызісных з'яў ў эканамічным і палітычным жыцці СССР. Прычыны перабудовы. Прыход М.С.Гарбачова да кіраўнітва краінай. Красавіцкі (1985 г.) Пленум ЦК КПСС і яго рашэнні. Накірункі перабудовы. Канкрэтызацыя задач новай палітыкі на XXVII з'ездзе КПСС і XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС. Крызіс аднапартыйнай сістэмы.

Асаблівасці гаспадарчага развщця БССР у агульнасаюзнай сістэме. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, ацэнка яе наступстваў, уплыў на сацыяльна-палітычны стан грамадства.

Фарміраванне шматпартыйнасці і палітычнай апазіцыі. З'яўленне нефармальных культурна-асветніцкіх арганізацый, змест іх дзейнасці, паступовае набыццё імі палітычнай накіраванасці, арганізацыйнае афармленне БНФ. Актывізацыя цікавасці да нацыянальнай гісторыі і культуры, крытыка зместу палітыкі КПСС і КПБ. Актывізацыя насельніцтва, няздольнасць КПБ прапанаваць грамадству альтэрнатыўныя шляхі развіцця. "Мітынговая дэмакратыя" вясны 1991 г. Стварэнне Беларускай сялянскай партыі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і інш.

Прыняцце Вярхоўным Саветам БССР законаў аб мовах, аб культуры, Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Крызіс СССР. Адасабленне Прыбалтыкі, Украіны, Грузіі, этнічныя канфлікты ў Нагорным Карабаху і інш. Рэферэндум аб захаванні СССР і яго вынікі. Праект падпісання новага саюзнага дагавора. Жнівеньскі путч 1991 г. і яго вынікі. "Парад суверэнітэтаў". Наданне канстытуцыйнага статуса Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Спыненне дзейнасці КПБ. Выбары новага кіраўніцтва Беларусі, змяненне назвы рэспублікі, прыняцце, новай сімволікі і закона аб грамадзянстве. Белавежскія пагадненні. Скасаванне СССР і стварэнне СНД. Ацэнка прычын і наступстваў распаду СССР у гістарычнай літаратуры.

### *Тэма 64–66. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Суверэнная Рэспубліка Беларусь на сучасным этапе*

Сістэмны крызіс постсавецкай прасторы. Асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь у першыя постсавецкія гады. Міжнароднае становішча і дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць урада Беларусі ў галіне скарачэння ўзбраенняў. Унутрыпалітычнае развіццё. Станаўленне шматпартыйнасці, асноўныя палітычныя партыі і іх праграмы. Узрастанне сацыяльна-эканамічнай напружанасці ў 1993-1994 гг..

Прыняцце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь прэзідэнцкай формы кіравання. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г. Прэзідэнцкія выбары 1994 г. Рэферэндум 24 лістапада 1996 г. і яго вынікі, змены ў Канстытуцыі Беларусі. Выбары 9 верасня 2001 г., рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. і ўмацаванне прэзідэнцкай улады. Прэзідэнцкія выбары 19 сакавіка 2006 г. і 19 снежня 2010 г..

Прыняцце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь прэзідэнцкай формы кіравання. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г. Прэзідэнцкія выбары 1994 г. Рэферэндум 24 лістапада 1996 г. і яго вынікі. Змены ў Канстытуцыі Беларусі. Выбары 9 верасня 2001 г. Рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. і ўмацаванне прэзідэнцкай улады. Прэзідэнцкія выбары 19 сакавіка 2006 г., 19 снежня 2010 г., 11 кастрычніка 2015 г., 9 жніўня 2020 г. і іх вынікі. Канстытуцыйныя асновы Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады. Асновы ідэалогіі Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыйны рэферэндум 27 лютага 2022 г. і яго значэнне.

Сутнасць і асноўныя рысы беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Дзяржаўныя прыярытэты ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы.

Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Эканамічнае, навукова-тэхнічнае, культурнае і гуманітаранае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі свету. Беларуская навука і культура на міжнароднай арэне. Удзел Беларусі ў міжнародных навуковых, культурных, спартыўных і інш. мерапрыемствах. Вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Павышэнне ролі музеяў, бібліятэк, культурна-асветніцкіх устаноў. Культура Беларусі ў сусветнай культурнай прасторы.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бяспалая, М. А. Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. [Электронный ресурс] : [вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)] / М. А. Бяспалая. – Мінск : БДУКМ, 2016. - 321 с. – Режим доступа: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/13466.

2. Бяспалая, М. А. Гісторыя Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: вуч.-мет. комплекс / М. А. Бяспалая : М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў – Мінск : БДУКМ, 2018. – 477 с.

3. История Беларуси : в контексте мировых цивилизаций : учеб.-метод. пособие / В. И. Голубович [и др.] ; под ред. В. И. Голубовича, Ю. Н. Бохана. – 3-е изд. – Минск : Экоперспектива, 2011. – 464 с.

4. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования / С. А. Елизаров [и др.]. – 2-е изд., испр. – Минск : Вышэйшая школа, 2016. – 398, [1] с.

5. Новик, Е. К. История Беларуси. С древнейших времен до 2012 г. : учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред.

6. Е. К. Новика. - 3-е изд., испр. и доп. - Минск : Вышэйшая школа, [2012]. – 542 с.

*7.* Асветнікі зямлі беларускай. X–XX ст. – Мн., 2001.

*8.* *Бяспалая, М. А.* Гісторыя Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: вуч.-мет. комплекс / М. А. Бяспалая : М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў – Мінск : БДУКМ, 2018. – 477 с.

9. Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура : зб. навук. арт. : [матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі] : у 2 ч. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; [уклад. А. А. Скеп'ян ; рэдкал.: У. Р. Гусакоў (старш.) і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 2 ч.

10. Вялікае Княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2005–2010. – 2 т.

*11.* *Гісторыя* Беларусі: у 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000. –351 с.

*12.* *Гісторыя Беларусі*. у 6 т. Т. 2. Беларусь у перыяд вялікага княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. - Мн.: Экаперспектыва, 2008. –688 с.

*13.* *Гісторыя* Беларусі: у 6 т. Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (ХУП-ХУІП) / Ю.Бохан, В.Голубеў, У.Емяльянчык і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2001. – 344 с.

